# ВОДЗЫЎ

на аўтарэферат дысертацыі ЗЯНОЎКІ Яўгеніі Сяргееўны

## "ЛІНГВААКУСТЫЧНЫЯ РЭСУРСЫ ДЛЯ БЕЛАРУСКАМОЎНЫХ СІСТЭМ СІНТЭЗУ МАЎЛЕННЯ: ФАРМІРАВАННЕ, ПРАГМАТЫЧНЫ ПАТЭНЦЫЯЛ, СПОСАБЫ АПТЫМІЗАЦЫІ",

прадстаўленай на саісканне вучонай ступені кандыдата філілагічных навук па спецыяльнасцях 10.02.01 – беларуская мова, 10.02.21 – прыкладная і матэматычная лінгвістыка

Актуальнасць дысертацыйнай працы Я.С. Зяноўкі абумоўлена недастатковай распрацаванасцю ў айчынным мовазнаўстве лінгваакустычных рэсурсаў ў сістэмах сінтэзу маўлення з улікам рытміка-меладычнай структуры беларускай літаратурнай мовы.

З апорай на рэпрэзентатыўны фактычны матэрыял (1000 камунікатыўна-сінтаксічных адзінак (сказаў-ілюстрацый), атрыманых метадам суцэльнай і мэтавай выбаркі з твораў пісьменнікаў, змешчаных у выданні «Беларуская літаратурная спадчына» і слоўніку І. Я. Лепешава «Фразеалагічны слоўнік беларускай мовы»), сучасныя камп'ютарныя тэхналогіі і выкарыстаныя метады і методыкі (апісальны і эксперыментальна-фанетычныя метады вывучэння адметных рыс беларускага маўлення, прыёмы колькасных падлікаў) саіскальнікам распрацаваны лінгваакустычныя рэсурсы, якія характарызуюць прасадычную арганізацыю беларускай мовы ў складзе сістэм сінтэзу маўлення. Выкарыстная саіскальнікам методыка даследавання і працэдурная арганізацыя спецыяльных міжгаліновых ведаў – лінгвістычных асноў беларускай прасодыі і камп'ютарных тэхналогій штучнага маўлення дазволілі аўтару вызначыць тыповыя інтанацыйныя мадэлі сінтагм для беларускамоўных сістэм сінтэзу маўлення і стварыць беларускамоўны прасадычны модуль для праграмнага комплексу «IntonTrainer», у аснову якога пакладзена рапрацаваная аўтарам лінгваакустычная база даных. Яна ўключае неабходны набор эталонных фраз, якія адлюстроўваюць інтанацыйныя асаблівасці мовы з пункту погляду сінтаксічнай структуры сказа, эмацыянальнай афарбоўкі, колькаснага складу сінтагм у сказе, а таксама колькасныя і якасныя вынікі аналізу інтанацыйных параметраў сучаснай беларускай літаратурнай мовы.

Аналіз зместу аўтарэферата сведчыць, што праведзенае Я.С. Зяноўкай даследаванне мае неабходныя актуальнасць, навізну і верагоднасць атрыманых вынікаў, самастойнасць пры вырашэнні пастаўленых задач, тэарэтычную значнасць і практычную накіраванасць. У гэтай сувязі саіскальнік заслугоўвае прысуджэння вучонай ступені кандыдата філалагічных навук за сукупнасць наступных навуковых вынікаў:

– правядзенне комплекснага аналіза лінгваакустычных рэсурсаў, якія адказваюць за дасканалае функцыянаванне прасадычнага працэсара ў машынных сістэмах;

– апісанне прасадычных характарыстык сродкаў арганізацыі беларускага маўлення і вызначэнне інтанацыйных мадэляў прасадычных партрэтаў сінтагм для беларускамоўнага сінтэзатара маўлення па тэксце;

– эксперыментальна-фанетычнае вывучэнне інтанацыйных канструкцый і ўстанаўленне заканамернасцей сінтагматычнага дзялення сказаў, што значна пашырае веды ў галіне прасодыі беларускай мовы;

– стварэнне беларускамоўнага модулю для комплексу «IntonTrainer», які ўключае набор эталонных фраз, што адлюстроўваюць інтанацыйныя асаблівасці мовы.

Прафесар кафедры тэорыі і
практыкі англійскага маўлення МДЛУ,
доктар філалагічных навук,
дацэнт В.А. Арцёмава

Рэспубліка Беларусь
Установа адукацыі
Мінскі дзяржаўны лінгвістычны універсітэт
г. Мінск

МИНСКИЙ ГОСУДАРСТВЕННЫЙ ЛИНГВИСТИЧЕСКИЙ УНИВЕРСИТЕТ
Подпись Арцемовой О.А.
УДОСТОВЕРЯЮ
Начальник отдела кадров МГЛУ
(П.П. Новиков)
200_ г.